Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

№ 9 (440)

# Беларускі ўніверсітэт

Орган парткома, рэктарата, мясцкома, камітэта ЛКСМБ і прафкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна

Субота, 25 сакавіка 1961 г.

Цана 1 кап.

## Больш творчай актыўнасці



Сярод вышэйшых навучальных устаноў горада Мінска шырока вядома сваімі дасягненнямі студэнцкае навуковае таварыства нашага ўніверсітэта. У 1960—61 навучальным годзе яно дасягнула значных поспехаў, на гарадскі агляд студэнцкіх навуковых работ сёлета было прадстаўлена 114 работ, з якіх 86 атрымалі першую і другую катэгорыю.

На справаздачным сходзе універсітэцкага СНТ, які адбыўся нядаўна, былі падведзены вынікі работы таварыства за мінулы год. Старшыня савета СНТ В. Снапко ў справаздачным дакладзе адзначыў, што асноўнай формай дзейнасці навуковага таварыства была гуртковая работа. Да кіраўніцтва даследчай работай студэнтаў прыцягнуты лепшыя сілы ўніверсітэта: прафесары, дацэнты, кандыдаты навук. Многія з іх сумелі прывіць студэнтам любоў да навукі. Значна ажывілі работу навуковыя гурткі філалагічнага факультэта і дабіліся значных поспехаў. Да ліку лепшых адносяцца гурткі біялагічнага і геаграфічнага факультэтаў.

Умелая пастаноўка работы СНТ садзейнічала творчаму росту іх удзельнікаў. Аб гэтым сведчыць гарадскі агляд студэнцкіх навуковых работ. На аглядзе значную частку склалі навуковыя работы нашых студэнтаў. Наш універсітэт прадставіў усяго на тры работы менш, чым палітэхнічны інстытут. Лепшымі з'яўляюцца даследванні студэнтаў: Г. Шмыгава з гістарычнага факультэта, В. Бохана з юрфака, В. Ганчаровай з фізфака, В. Жданко і Г. Наркевіч з геафака, І. Аляшчонак з філфака і іншыя.

Аднак нараду з поспехамі ў рабоце СНТ маюцца яшчэ сур'ёзныя недахопы.

На сходзе адзначалася, што дрэнна працавалі на працягу года гурткі фізічнага і юрыдычнага факультэтаў. Саветы СНТ гэтых факультэтаў нядбайна аднесліся да правядзення навуковых канферэнцый. Студэнты гэтых факультэтаў не ведаюць, чым займаюцца іх навуковыя таварыствы.

Выступіўшая затым аспірантка Галіна Галкоўская адзначыла, што вялікая значэнне ў рабоце гурткоў мае роля іх кіраўнікоў-выкладчыкаў. Аднастайнасць у рабоце СНТ універсітэта прыводзіць да таго, што навуковая работа яшчэ не карыстаецца папулярнасцю сярод студэнтаў. І паэтаму СНТ малалікае. Карысна было б арганізаваць студэнцкія канструктарскія бюро, міжфакультэцкія лекцыі, змяніць структуру савета СНТ.

Выступаўшыя адзначалі, што студэнцкія навуковыя работы дрэнна афармляюцца і нават з памылкамі здаюцца на гарадскі агляд. Гэта гаворыць аб тым, што некаторыя навуковыя кіраўнікі і кафедры недастаткова сур'ёзна і непатрабавальна падыходзяць да рэкамендацыі навуковых работ. У рабоце навуковага таварыства слабы кантакт паміж саветам СНТ, кафедрамі, выкладчыкамі і грамадскімі арганізацыямі ўніверсітэта. Многія кіраўнікі гурткоў лічаць лішнім займацца арганізацыйнай работай у гуртках. Камітэт камсамола і прафком абмяжоўваюць часам свае адносіны да навукова-даследчай работы ўсяго толькі зборам фактаў.

Аб далейшых перспектывах навуковай работы ва ўніверсітэце гаварыў у сваім выступленні прарэктар па навуковай частцы Г. А. Павец'еў.

Сход выбраў новы склад савета СНТ. Старшынёй савета абраны аспірант Ул. Ціток.

А. ФУРЫК.



*На здымках: 1. Выступае старшыня СНТ Валяры Снапко. Ёсць аб чым расказаць. Нямала недахопаў было ў рабоце СНТ 2. Прарэктар універсітэта па навуковай рабоце Г. А. Павецьеў уручае памятны падарунак студэнтцы V курса філфака В. Басалыга. Яе навуковая работа «Паэтызацыя працы ў паэме Я. Коласа «Новая зямля» атрымала на гарадскім аглядзе дыплом I ступені.*



*Добра вучышся—добра абаронііш дыпломную. Пра гэту запаведзь ніколі не забывала студэнтка V курса хімічнага факультэта Людміла Пансевіч-Каляда. Цяпер дыпламантка працуе пад кіраўніцтвам дацэнта К. А. Пячэрскай над дыпломнай работай: «Новыя злучэнні ў шэрагу спіранавых вуглевадародаў».*

*На здымку: Л. Пансевіч-Каляда рыхтуе прыборы для пастаноўкі вопыта па тэме дыпломнай работы.*

Фота В. Анцыферава.

## ТВАЯ ДЫПЛОМНАЯ РАБОТА

Наступае вясна. Напружаны гэта час для студэнтаў, асабліва для пяцікурснікаў. Гэта час, калі трэба абараняць дыпломныя работы.

Дыпломная работа... Гэта твая праверка на сталасць, пяцікурснік, твае веды, якія ты атрымаў ва ўніверсітэце за пяць год вучобы, заключны этап перад шырокай дарогай у самастойнае жыццё. Абараніўшы дыпломную, здаўшы затым дзяржаўныя экзамены, пяцікурснікі развітаюцца з універсітэтам.

А пакуль што студэнты розных факультэтаў у апошні раз праглядаюць старонкі і раздзелы сваіх дыпломных работ, здаюць іх навуковым кіраўнікам.

Як жа абстаяць справы на факультэтах?

Многа і пладавіта папрацавалі студэнты гістарычнага факультэта. Многія з іх ужо напісалі свае дыпломныя работы. Так, студэнты Корчык і Кухарэнка свае дыпломныя работы прысвяцілі гісторыі асобных беларускіх гарадоў.

Ніхто раней не пісаў такой работы, як «Студэнцкі рух у Расіі ў перыяд рэвалюцыйнай сітуацыі ў 1859—61 гг.». Цяпер жа аб гэтым напісаў Міхаіл Піліпенка. Хутка будзе абараняць сваю дыпломную работу Э. Іоффе. Яго цікавіць гісторыя барацьбы венгерскіх інтэрнацыяналістаў у гады грамадзянскай вайны. Сучаснасці прысвечана работа А. Мацко, якая называецца: «Барацьба гвінейскага народа за незалежнасць і самастойнае эканамічнае развіццё».

Самыя разнастайныя тэмы можна сустрэць сярод дыпломных работ. Кожная тэма—гэта нешта новае, невядомае, распрацоўка якога-небудзь пытання, аб якім мала пісалася, гаварылася. Многія з тэм, пачатыя яшчэ ў студэнцкіх навуковых гуртках, разрасліся затым, паглыбіліся, звязаны з практычнай работай, вопытамі. Так, напрыклад, не першы год працуюць над пытаннямі, якія выліліся затым у дыпломныя работы, студэнты хімфака Сакалоў, Язычэнка, Пярцоўскі, Шымановіч. Частка дыпломнікаў хімічнага факультэта паспяхова працуе над сваімі работамі ў Акадэміі навук БССР, на заводзе медпрэпаратаў. Студэнты вывучаюць солі Старобінскага калійнага камбіната, знаёмяцца з уласцівасцямі вокіслаў цэлюлозы, кінецікай палімераў, цвёрдых цел. На гэтыя тэмы пішуць работы В. Астапенка, В. Лапцева, А. Межанцава і інш.

Хімія—навука будучага. Многія пытанні, якія зараз распрацоўваюць студэнты, знойдуць шырокае прымяненне ў народнай гаспадарцы.

Большасць дыпломных работ студэнтаў біялагічнага факультэта прысвечаны розным пытанням сельскай гаспадаркі, раслінаводства, глебазнаўства, рыбаводства. Студэнткі Шушкіна і Печань выбралі тэмай сваіх работ заапланктонны мір возера Нарач.

У 1959 годзе студэнт філфака Аляксандр Шыкаловіч ездзіў у дыялекталагічную экспедыцыю. Там ён сустрэўся з рознымі дыялектамі беларускай мовы. Пазней А. Шыкаловіч напісаў работу: «Сельскагаспадарчая лексіка вёскі Такарышкі, Юрацішкаўскага раёна, Гродзенскай вобласці». Новая, цікавая тэма! Работа, над якой студэнт працаваў з вялікім задавальненнем, будзе абараняцца 30 сакавіка.

А вось студэнта юрыдычнага факультэта Е. Падголіна цікавіць адвакацкая работа. Ён напісаў дыпломную пад назвай: «Абарончая прамова».

Прылежна, з душой працуюць многія пяцікурснікі над сваімі дыпломнымі работамі. Аб іх стараннi, актыўнасці гавораць выкладчыкі, навуковыя кіраўнікі. Але ёсць яшчэ частка людзей, якія нядбайна адносяцца да гэтага важнага пытання, спазняюцца ў лабараторыі, кабінеты, марнуюць дарагі час. Не так даўно на паседжаннях вучоных саветаў гаварылася аб несур'ёзных адносінах да сваіх дыпломных работ студэнтаў хімфака Казакевіч і Кулікава, гістфака—Касінец і Алексінай.

Усё бліжэй час абароны дыпломных. Трэба прыкласці максімум сіл і працы, каб абараніць іх на «добра» і «выдатна».

Поспехаў вам, дыпломнікі!

Р. ЗАЛЕСКІ.

## ПА ЎНІВЕРСІТЭТУ

### Перамаглі штангісты юрфака

Закончылася першынство універсітэта па цяжкай атлетыцы па праграме круглагадовай спартакіяды. Выявіліся каманда-пераможца і чэмпіёны ўніверсітэта ва ўсіх вагавых катэгорыях.

У спаборніцтвах удзельнічала больш 30 спартсменаў юрыдычнага, фізічнага, хімічнага і матэматычнага факультэтаў. Здзіўляе той факт, што гісторыкі і філолагі нават не выставілі сваіх каманд.

Вострая барацьба разгарэлалася, у асноўным, паміж юрыстамі і фізікамі. Шматлікія балельшчыкі на гэты раз аддавалі перавагу фізікам, за каманду якіх выступала 7 спартсменаў-другаразраднікаў. Але юрысты, выступіўшы дружна, сталі чэмпіёнамі ў камандным заліку. Новы рэкорд універсітэта ў жыме сярод спартсменаў паўсярэдняй вагавай катэгорыі ўстанавіў В. Шаверын: 100 кг (стары рэкорд—97,5 кг).

Вось чэмпіёны універсітэта 1961 года ў парадку вагавых катэгорый: В. Камайлаў (юрфак), С. Чыгір (юрфак), Ф. Дрых (фізфак), В. Бялоў (фізфак), В. Шаверын (юрфак), С. Гусеў (фізфак), В. Павецьеў (юрфак), В. Лабецкі (хімфак).

Прайшоўшыя спаборніцтвы паказалі, што за прызавыя месцы змагаліся толькі члены зборнай універсітэта, тыя, хто рэгулярна наведвае секцыю. Толькі сістэматычныя трэніроўкі прыносяць поспех!

(Наш кар.)

### У ДАПАМОГУ СТУДЭНТАМ

Кафедра гісторыі СССР наладзіла рэгулярны паказ дакументальных і навукова-папулярных фільмаў у дапамогу студэнтам, якія вывучаюць гісторыю СССР. Акрамя таго, дэманструюцца фільмы і кіначасопісы на мастацкія тэмы, аб сучасным міжнародным становішчы. Толькі ў сакавіку гэтага года ў кабінеце гісторыі СССР дэманстраваліся фільмы «Чайкоўскі», «Мастацтва вялікай праўды», «Акадэмія мастацтваў». 24 сакавіка будзе паказан навукова-папулярны фільм «Я быў спадарожнікам сонца», а 31 сакавіка—кіначасопісы «Сучасная Куба» і «Віва, Куба!». Перад паказам гэтых кіначасопісаў дацэнт Г. М. Трухноў выступіць з гутаркай аб падзеях у рэвалюцыйнай Кубе.

### Госці з Вільнюса

У аўторак на Мінскім вакзале студэнты нашага ўніверсітэта сустракалі гасцей—студэнтаў хімічнага факультэта Вільнюскага дзяржаўнага універсітэта імя Капсукаса. Літоўскія студэнты з вялікім задавальненнем пазнаёміліся з выдатнымі мясцінамі г. Мінска, яго музеямі і вышэйшымі навучальнымі ўстановамі. Госці блізка цікавіліся пастаноўкай навучання на хімічным факультэце БДУ, знаёміліся з работай лабараторый розных кафедр. хімфака.

Пазаўчора нашы госці выехалі дадому.



# З намі ў новыя ПАХОДЫ!






**БЯЗМЕЖНЫЯ** прасторы Беларусі! Ваша прыгажосць кранае сэрца кожнага, каму даводзілася бываць сярод маляўнічых лясоў і палёў, рэк і лугоў, азёраў. На карце Беларусі, дарагі чытач, ты бачыш маршруты, па якіх хадзілі турысты нашага ўніверсітэта ў час зімовых канікулаў. На гэтай старонцы яны раскажуць табе аб сваіх уражаннях і справах.

## Турызм становіцца масавым

**ЗРАБІЦЬ** турызм самым папулярным відам адпачынку і самым масавым відам спорту—такая праграма ўніверсітэцкай секцыі турызма-альпінізма. За апошнія тры гады ў гэтым напрамку шмат ужо зроблена.

Возьмем, напрыклад, зімовыя паходы. У 1959 годзе быў праведзен усяго толькі адзін лыжны паход па Беларусі, у якім удзельнічала шэсць чалавек. У 1960 годзе ў лыжныя паходы па Беларусі накіраваліся чатыры групы з агульным лікам удзельнікаў больш трыццаці чалавек. І нарэшце, у 1961 годзе быў арганізаван масавы агітацыйны паход, прысвечаны 40-гаддзю БДУ імя У. І. Леніна. Удзельнікі пахода трынаццацю групамі прайшлі па ўсіх абласцях Беларусі і прачыталі сярод насельніцтва дзесяткі гутарак і лекцый. Акрамя таго, быў арганізаваны паход другой катэгорыі цяжкасці па Кольскаму паўвостраву. Усяго ў зімовых паходах 1961 года ўдзельнічала больш ста чалавек.

У нашай секцыі займаюцца цяпер прадстаўнікі ўсіх факультэтаў, але самымі актыўнымі з'яўляюцца студэнты фізічнага факультэта. Яны, напэўна, не забываюць, што турызм з будучага навучальнага года будзе ўведзен у круглагадовую спартакіяду, і даюць заяўку на першае месца. Мінулай восенню наша секцыя на рэспубліканскім злёце турыстаў заняла другое месца.

Прыемным фактам з'яўляецца расшырэнне дыяпазона нашых падарожжаў. Калі раней праводзіліся, у асноўным, толькі горныя паходы па Каўказу, то цяпер мы плануем самыя разнастайныя падарожжы па розным раёнам нашай краіны. На лета гэтага года намячаюцца паходы па Беларусі, Карпатам, Крыму, Каўказу, Уралу, Цянь-Шаню. Цяпер нашы турысты ўжо пачалі падрыхтоўку да летніх паходаў: абмяркоўваюцца маршруты будучых паходаў, падрыхтоўваецца неабходнае снаражэнне, праводзяцца трэніроўкі.

У канцы сакавіка мы пачнем выязджаць за горад з начоўкамі. Такія паходы будуць арганізаваны на кожным факультэце.

Так, турызм — цудоўны адпачынак, загартоўка арганізма, сродак, забяспечваючы ўсебаковае фізічнае развіццё чалавека.

Цяпер ужо рэдка сустракаюцца людзі, якія раз-другі прыняўшы ўдзел нават ў невялікіх аднадзённых паходах, не станавіліся б потым перакананымі турыстамі.

**А. ФЕДЭНКА,**
дацэнт, старшыня бюро секцыі турызма і альпінізма.



Адзін за другім, крок за крокам, то на лыжах, то пехатою—так праходзяць турысты дзесяткі кіламетраў. Фота **В. Саввы.**

## Чалавек з рукзаком

*ШТО АЗНАЧАЕ «захварэць турызмам?». Гэта азначае ўбачыць прыроду роднага краю ва ўсёй яе прыгажосці, падыхаць сярод гэтай прыроды свежым, бадзёрачым паветрам, папасці ў вадаварот усемагчымых уражанняў і вясёлых здарэнняў. Калі вы няветлівы і замкнуты чалавек, у паходзе вы становіцеся здаровым, бадзёрым, радасным. Ваш настрой падымецца адразу ж, калі вы, атрымаўшы ад інструктара загад № 1, з'ясцё кацялок кашы, а прайшоўшы першыя кіламетры, вы адразу адчуеце прыліў сіл, бадзёрасць, жыццерадаснасць. І вы пойдзеце зноў наперад, не адчуваючы стомы, мацнеючы з кожным днём...*



На прывале. Фота **М. Скарабагатава.**

*У гэтым годзе снег быў рэдкасцю. Але турысты ўмеюць выкарыстоўваць нават самыя нязначныя магчымасці. І як толькі зямля пакрылася белым пухам, наша група адправілася ў паход па маршруту Баранавічы—Навагрудак — Масты. Пачатак быў цудоўным. Першыя дні мы ішлі, радуючыся добраму надвор'ю, лёгкаму марозцу, яркаму сонцу.*

*...Мы ідзём па лесе. Махнатыя яліны адзеты ў іней, лёгкая пароша заслала ўсе сцяжынкі і дарожкі. Нідзе ні следу. І толькі мы пракладваем сярод гэтай цаліны першы след.*

*Шмат было цікавага ў паходзе. Мы былі ў доме-музеі Адама Міцкевіча ў горадзе Навагрудку, а адтуль прыйшлі на шклозавод «Нёман», дзе нам падарылі шклянога повара. Мы зрабілі яго сваім амулетам.*

*Мы бачылі казачнае Свіцязь-возера. Яго беласнежная чаша акружана чаруючай каёмкаю леса. Іскрацца дрэвы, адзетыя ў іней. Становімся і доўга любуемся цудоўнай панарамай.*

*І ўсё ж самае цудоўнае ў турысцкім паходзе—гэта людзі, з якімі мы сустракаліся. Нам не забыць цёплых сяброўскіх сустрэч з калгаснікамі, жыхарамі вёсак, невялікіх гарадоў.*

*А як мы пасябравалі адзін з другім! Бо людзі, якія ідуць па адной лыжні—дружныя людзі, спаяныя ў адзін бадзёры, аптымістычны калектыў.*

*За час нашага падарожжа мы далі пяць канцэртаў мастацкай самадзейнасці, правялі шмат гутарак у калгасах, і нам цёпла дзякавалі за гэта людзі.*

*У Беларусі ўжо прывыклі да людзей з рукзакамі. Так, чалавек з рукзаком—гэта добры чалавек, спартсмен, нястомны даследчык роднага краю.*

**В. ПОСТНІКАВА,**
студэнтка 5-га курса фізфака.

### НЯДРЭННА БЫЛО Б...

**...каб у паходах прыняло ўдзел не 100, а 1000 студэнтаў усіх факультэтаў.**

**...каб кафедра фізічнага выхавання паклапацілася аб снаражэнні. 10 палатак, 40 рукзакаў—гэта вельмі мала для ўніверсітэта!**

**...каб універсітэт меў свой турысцкі клуб.**

### ТУРЫСТЫ ВУЧАЦЦА

ДЛЯ ЎДЗЕЛЬНІКАЎ секцыі турызма-альпінізма ў мінулым сяместры быў прачытан цыкл лекцый аб развіцці турызма ў СССР, аб яго значэнні, аб арганізацыі паходаў, падборы снаражэння, медыцынскай дапамозе ў час падарожжаў і інш. Затым 34 найбольш вопытныя турысты паспяхова здалі залік па турызму. Яны атрымалі пасведчанні грамадскіх інструктараў па гэтаму віду спорту.

Кандыдат фізіка-матэматычных навук старшыня бюро секцыі А. С. Федэнка нядаўна прачытаў лекцыю: «Альпінізм—школа мужнасці», асістэнт матэматычнага факультэта, старшыня маршрутнай камісіі М. Я. Неменман—лекцыю: «Вашы маршруты, турысты» і г. д.

У другім сяместры 1961 года таксама будуць арганізаваны лекцыі на турысцка-альпінісцкія тэмы. Іх прачытаюць актывісты секцыі.

Часта для ўдзельнікаў секцыі будуць дэманстравацца тэматычныя кінафільмы. Усё гэта разам з трэніроўкамі дапаможа турыстам павысіць іх спартыўнае майстэрства.

**В. КАПЦІЛОВІЧ.**

## На ўлонне прыроды, сябры!

*ХУТКА вясна. Цудоўны час, калі душа чалавека і прыроды дзіўна сугучны.*

*Вясна... Як хораша на досвітку прабегчы босым па роснай траве, памыцца ў звонкім вясеннім ручаі, здрыгануцца ад ранішняй бадзёрай свежасці, зрабіць зарадку, узбегчы на прыгорак і здзівіцца яркасці вясенніх колераў і кветак! Як прыемна пабыць удалечыні ад вузкіх вуліц горада, ад шуму машын.*

*А крыху пазней, надзеўшы на плечы важкі рукзак, добра прайсці кіламетраў дваццаць пяшком, дзівячыся на хаду ўсё новым і новым малюнкам прыроды, і вярнуўшыся дадому з цэлым ахапкам кветак ў руках, злёгку загарэўшы, адчуць, якое велізарнае задавальненне вы атрымалі, колькі свежасці, колькі энергіі з'явілася ў вашым целе.*

*А якой процілегласцю будзе адпачынак людзей, якія засталіся ў горадзе, тоўпіліся ў чарзе, сядзелі ў душным кінотэатры, або проста сумавалі дома. Хіба гэта адпачынак? Хто за карысны, здаровы адпачынак, прыходзьце да нас, турыстаў! Як толькі сыйдзе снег з палёў, зазеляняюць лясы, трава, мы зноў адправімся ў паходы. Мы будзем начаваць у лесе, будзем любавацца ўзыходам сонца, нашы твары будзе лашчыць вясёлы, пяшчотны ветрык.*

**І. ШЧУКІНА.**
студэнтка матфака.



Зроблены перапынак—можна і падмацавацца. На апетыт турысты не скардзяцца.

Фота **В. Абухава.**

### ПА СТАРОНКАХ ГАЗЕТ

...Каля 50 студэнтаў універсітэта атрымаюць значкі «Турыст СССР», а 17 найбольш вопытных закончылі выкананне норм трэцяга спартыўнага разрада.

**«Фізкультурнік Беларусі».**

У дні студэнцкіх канікулаў старажытны Навагрудак стаў месцам наведвання многіх турыстаў. З адной групай мы пагутарылі. Гэта былі студэнты фізічнага факультэта БДУ імя У. І. Леніна, члены турысцкай секцыі. Яны агледзелі вуліцы горада, курган Бессмяроцця, руіны старажытнага замка.

**«Звязда»,**
Навагрудская раённая газета.

Турысцкая група студэнтаў БДУ імя У. І. Леніна, якая робіць паход па маршруту Полацк—Браслаў пабыла на нашай будоўлі.

**«Знамя новостройки»,**
шматтыражка Полацкага нафтабуда.

**Рэдактар М. ЦІКОЦКІ.**

НАШ АДРАС:
**Мінск,**
**Універсітэцкі гарадок,**
**біякорпус, 31.**
**Тэлефон: 2-07-19.**
**Друкарня выдавецтва**
**БДУ імя У. І. Леніна.**

АТ 02203. Зак. 856.